Беларусь.info

№95 8/08/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Актывісты "Партнёрства" прызнаныя вязнямі сумлення.** «Міжнародная амністыя» запатрабавала неадкладна вызваліць чатырох актывістаў «Партнёрства». Аўтарытэтная праваабарончая арганізацыя абвясціла Мікалая Астрэйку, Эніру Браніцкую, Цімафея Дранчука і Аляксандра Шалайку «вязнямі сумлення». Нагадаем, грамадскіх актывістаў асудзілі за стварэнне і кіраванне незарэгістраванай арганізацыяй. Астрэйка атрымаў 2 гады калоніі агульнага рэжыму, Дранчук — год, Браніцкая і Шалайка — па 6 месяцаў пазбаўлення волі. «Гэтыя чатыры маладыя чалавекі былі прыгавораныя за легітымную рэалізацыю правоў на свабоду аб'яднанняў», — заявіла прадстаўніца «Міжнароднай амністыі» Хезер МакГіл.

**Брэсцкую галадоўніцу Любоў Разановіч шпіталізавалі.** Жанчына знаходзіцца ў стане сярэдняй ступені цяжкасці. Разановіч трымае галадоўку з 5 ліпеня. Апошнія 8 дзён яна не піла нават вады. Цяжкі стан выкліканы якраз доўгім галадаваннем і абязвожваннем арганізму. Цяпер жанчына знаходзіцца ў Цэнтральнай гарадской больніцы.

**Брэсцкія галадоўнікі адмовіліся спыняць акцыю. Але яны баяцца за жыццё сваёй калегі.** Любоў Разановіч не хоча класціся ў больніцу. У жанчыны, якая трымае сухую галадоўку, пачаліся праблемы з ныркамі. Некалькі гадоў таму ў яе была цяжкая аперацыя. Падчас галадоўкі яна штодня траціць прытомнасць, у яе кружыцца ў галаве. Калегі прапаноўвалі ёй спыніць галадоўку, бо жанчына мае дваіх дзяцей. Але іх намаганні былі марнымі. Нагадаем, што галадоўка ў Брэсце пачалася 5 ліпеня. Цяпер у ёй удзельнічаюць 15 чалавек.

# Факты

**На птушкафабрыцы "Асобіна" Буда-Кашалёўскага раёну за ноч загінулі 100 тысячаў курэй.** Ветэрынары адмаўляюць версію птушынага грыпу. Спецыялісты з Беларускага дзяржаўнага ветэрынарнага цэнтру не знайшлі ў курэй ніякіх інфекцыяў, што маглі б выклікаць масавы паморак. Першапачатковай версіяй яны называюць атручванне камбікормам. Лекары кажуць, што пагрозы чалавечаму здароўю і жыццю няма.

**Расея можа абмежаваць продаж беларускіх камбайнаў**. Расейскі саюз вытворцаў сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталяваньня для аграпрамысловага комплексу "Саюзаграмаш" зьвярнуўся ў міністэрства эканамічнага разьвіцьця сваёй краіны зь ініцыятывай увядзеньня кампэнсацыйнага мыта на беларускія кормаўборачныя камбайны.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org